**Матэрыялы са “Зборніка заданняў па марфалогіі для паўтарэння вывучанага, падрыхтоўкі да экзамену і ЦТ. Х клас”**

**В.А. Валюкевіч, настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай катэгорыі**

## НАЗОЎНІК

**1.Устанавіце памылковыя высновы, якія супярэчаць агульна прынятым у навуцы меркаваннем. Выпраўце дапушчаныя недакладнасці. Запішыце.**

1.Назоўнік – гэта самастойная часціна мовы, якая мае значэнне прадметнасці. Граматычнымі сродкамі выражэння прадметнасці служаць род, лік, склон, спражэнне.

2.Назоўнікі, якія маюць форму толькі множнага ліку, не маюць роду.

3.Асабовыя назоўнікі – гэта адушаўлёныя назоўнікі, якія абазначаюць асоб і жывых істот.

4.Назоўнікі *атрад, аркестр, дружына, група, калектыў* абазначаюць сукупнасць жывёл, прадметаў, але зборнымі не з’яўляюцца.

5.У сучаснай беларускай мове налічваецца 5 склонаў.

6.Назоўнікі *капучына, караоке, ківі* маюць ніякі род.

**2.Падкрэсліце адушаўлёныя назоўнікі.**

Русалка, нябожчык, полк, артыст, заяц, ферзь, студэнцтва, карп, сябар, навальніца, табун, мікроб, радасць, верабей, бацыла, натоўп,статуя, клён, армія, госць.

**3.Падкрэсліце канкрэтныя назоўнікі.**

Жаль, маланка, навучанне, сорам, дзень, бег, кніга, чырвань, рэалізм, метр, здароўе, камп’ютар, паўстанне, вецер, цыбуля, справядлівасць, гарачыня, штуршок, спатканне, малако.

**4.Падкрэсліце зборныя назоўнікі.**

Садавіна, вецце, настаўніцтва, бярэзнік, пер’е, мазоль, дуб, купэ, лісты, какава, карані, карэнне, сталы, сумленне.

**5.Падкрэсліце рэчыўныя назоўнікі.**

Цеста, сталь, сімволіка, шоўк, варэнне, машкара, анальгін, халаднік, купіна, паста.

**6. Запішыце назоўнікі ў форме множнага ліку.**

| | | | |
|---|---|---|---|
| Воўк- | Войска- | Неба- | Селянін- |
| Пяро- | Шынель- | Снягір- | |
| Вуха- | Торт- | Інжынер- | |

**7. Падкрэсліце адной рыскай назоўнікі, якія ўжываюцца толькі ў форме адзіночнага ліку, і дзвюма рыскамі, якія ўжываюцца толькі ў форме множнага ліку.**

Дзвіна, верасень, чырвань, нажніцы, кніга, студэнцтва, натоўп, суткі, гняздо, крыло, сумленнасць, Гродна, чалавек, Баранавічы, слова, паводзіны, крупы, Альпы.

**8.Перакладзіце словазлучэнні на беларускую мову, запішыце ў форме назоўнага і творнага склону.** *Узор: длинная тень – доўгі цень, доўгім ценем.*

| | Назоўны склон | Творны склон |
|---|---|---|

| | | |
|---|---|---|
| кубанская степь | | |
| розовый шиповник | | |
| зубастая щука | | |
| охотничья собака | | |
| серый гусь | | |
| золотая медаль | | |
| одна бровь | | |
| молодой тополь | | |
| неправильная дробь | | |
| густая пыль | | |
| маленький щенок | | |
| красивая туфелька | | |
| горькая полынь | | |
| аккуратная запись | | |
| солдатская шинель | | |

**9.З наступнымі назоўнікамі складзіце і запішыце словазлучэнні (прыметнік + назоўнік).** *Узор: какаду- маленькі какаду.*

| | | | |
|---|---|---|---|
| пані | | тарнада | |
| салямі | | еўра | |
| Тбілісі | | Антарыа | |
| Атэлье | | БДУ | |
| Чылі | | канферансье | |

**10. Падкрэсліце назоўнікі, у якіх у форме творнага склону адбываецца падаўжэнне зычных.**

Радасць, Беларусь, шыр, далеч, глыб, Свіслач, гладзь, вільгаць, Сібір, верф, прыгажосць, Прыпяць, сінь, соль, косць, ноч, медзь, горыч, мыш, роспач, дзевяць, Нарач, маладосць, квецень, мазь, сем, шэсць, восем.

**11.Дапішыце патрэбныя канчаткі.**

Вопытн…экскурсавод Ірына Паўлава, таленавіт… дызайнер Пётр Глушко, Ніна Пятроўна – цудоўн… доктар, садоўнік стаў сведка…, дапамог Жэн… Сакалову,гаспадар быў праныра…, Таня стала зазнайка…, Арцём быў запявала…, сустрэўся з чысцёха… Сяргеем, не сябрую з няўмека… Святланай.

**12.Запішыце назоўнікі, якія ў форме роднага склону, маюць канчаткі –а (я) у першы слупок, а якія маюць канчаткі – у (ю) у другі слупок.**

Візіт, гром, вопыт, вожык, абеліск, горад, лес, квас, ручай, настрой, Віцебск, батальён, пыл, час, варыянт, выбар, экзамен, май, хлеб, тэкст, смутак, фантан, аловак, аўторак, кіламетр, бераг, фашызм, лік, інстытут, калгас, спорт, хакей, вальс, шакалад, лясок, вішняк, месяц, шоўк,слых, чай.

| -а (я) | -у (ю) |
|---|---|
| | |
| | |
| | |
| | |

**13. Адзначце словазлучэнні з памылкай у напісанні канчатка назоўніка. Запішыце правільную форму слова.**

| | |
|---|---|
| плыць па раке | |
| пайсці з Пецем | |
| вылучацца стараннасцью | |
| бегчы рыссю | |
| сумую па Мішы | |
| развітацца з Васяй | |
| не бачыў зайчані | |
| каля трох бярозкаў | |
| дам есці сабаку | |
| сустракаўся з дзядулем | |
| расці на зямле | |
| у правай ручцы | |
| побач з хвоей | |
| стаяць на гары | |
| павітацца з Таняй | |
| стаяць на беражку | |
| сустрэча з Сібірру | |
| з шасцью вучнямі | |

**14.У адной з беларускіх песень ёсць такія радкі:** ***"Панаехала гасцей з іншаземных абласцей. Не, няправільна, - гасцёў з іншаземных абласцёў".*** **Які з варыянт склонавай формы правільны? Запішыце нарматыўныя словазлучэнні, выбраўшы ў дужках адпаведны варыянт.**

1. Крыламі ( лебедзей, лебядзей, лебедзяў, лебядзёў).
2. Сустрэліся (на млыне, у млыне).
3. Выйшлі з (туманаў, туманей, туманоў. туманёў).
4. Прыйшлі без (шынелей, шынеляў, шынялей, шынялёў).
5.Здзічэлыя (броды, брады).
6. Скокнуць з (моста, мосту, маста).
7. Букет (браткаў, братак, браткоў).

**15. Запішыце ў першы слупок нумары назоўнікаў, якія пішуцца разам, а ў другі – праз злучок.**

1) (фота) вітрына; 2) (віцэ) адмірал; 3) (відэа) камера; 4) (супер) зорка; 5) (экспрэс) дастаўка; 6) (міні) сукенка; 7) (штаб) кватэра; 8) (радыё) механік; 9) (бія) цыкл; 10) (контр) атака; 11) (мікра) раён; 12) (мед) сястра;14) (прэм'ер) міністр; 15) (нацыянал) дэмакрат; 16) (рай) цэнтр; 17) (паў) горада; 18) (метэа) зводка; 19) (Давыд) Гарадок; 20) (развед) група; 21) (плашч) палатка; 22) (прыма) балерына; 23) (сарві) галава; 24) (ікс) прамяні; 25) (кілават) гадзіна; 26) (паў) Беларусі; 27) (дом) музей; 28) (двухсот) годдзе; 29) (контр) адмірал; 30) (экс) чэмпіён; 31) (жалеза) бетон; 32) (авія) пасажыр.

| Разам | Праз злучок |
|---|---|
| № | № |

| | |
|---|---|
| | |

**16.Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Запішыце. Выпішыце тры назоўнікі і зрабіце іх марфалагічны разбор.**

| | |
|---|---|
| *Тропа в тайге выбита звериными лапами и копытами. Человеку трудно идти ти звериной тропой. Ноги то тонут во мху, то скользят по упругой хвое. Суковатые валежины цепляются за одежду, еловые лапы бьют по лицу. И чёрные дупла старых осин следят за тобой, словно чьи-то глаза.* | |

**17. Выканайце тэст па тэме: “Род назоўнікаў”.**

***1. Адзначце назоўнікі, род якіх у рускай і беларускай мовах не супадае:***

1) жаль;
2) медаль;
3) педаль;
4) тарнада;
5) Гродна.

***2.Адзначце скланяльныя назоўнікі мужчынскага роду:***

1) сабака;
2) гусь;
3) столь;
4) боль;
5) палын.

***3.Адзначце скланяльныя назоўнікі жаночага роду:***

1) шаль;
2) шынель;
3) боль;
4) салата;
5) кішэнь.

***4.Адзначце скланяльныя назоўнікі ніякага роду:***

1) Свіцязь;
2) зайчаня;
3) цуд;
4) брыво;
5) шво.

***5.Адзначце нескланяльныя назоўнікі мужчынскага роду:***

1) пенальці;
2) Антарыя;
3) аташэ;

4) фламінга;
5) танга.

***6.Адзначце нескланяльныя назоўнікі жаночага роду:***

1) хіндзі;
2) Ай-Петры;
3) авеню;
4) сірока;:
5) Токіа.

***7.Адзначце нескланяльныя назоўнікі ніякага роду:***

1) манпасье;
2) кенгуру;
3) фрэйлен;
4) бра;
5) салямі.

***8.Адзначце назоўнікі з правільнымі канчаткамі ў форме творнага склону:***

1) прыгожай шаллю;
2) салдацкім шынялём;
3) густой пылью;
4) дзіцячай туфляй;
5) працоўным мазалём.

***9. Адзначце правільна ўтвораныя сінтаксічныя канструкцыі:***

1) прыгожае Свіцязь;
2) вялізная цэцэ;
3) новы ВНУ;
4) смачная кальрабі;
5) цікавы ЛіМ.

***10.Адзначце няправільна ўтвораныя сінтаксічныя канструкцыі:***

1) маладая тэрапеўт Іванова;
2)Сяргей быў няўмекай;
3)выступіла дырэктар Пятрова;
4) незвычайная раман-споведзь;
5) вопытны прадавец Вольга.

**18. Выканайце тэст па тэме: “*Адушаўлёныя і неадушаўлёныя, канкрэтныя і абстрактныя, зборныя і рэчыўныя назоўнікі”.***

**1. Адзначце *адушаўлёныя* назоўнікі:**

1) калектыў;
2) жаніх;
3) звер;
4) рэаліст;
5) моладзь.

**2.Адзначце *неадушаўлёны*я назоўнікі:**

1) птаства;
2) чмель;
3) лабарант;

4) дэсант;
5) грак.

**3.Адзначце *абстрактныя* назоўнікі:**
1) прынцып;
2) гіпноз;
3) крык;
4) горад;
5) тэкст.

**4.Адзначце *канкрэтныя* назоўнікі:**
1) прадпрыемства;
2) вішня;
3) адчай;
4) вопыт;
5) косць.

**5.Адзначце *зборныя* назоўнікі:**
1) пер'е;
2) камяні;
3) праменне;
4) асіннік;
5) зграя.

**6.Адзначце *рэчыўныя* назоўнікі:**
1) інвентар;
2) гарох;
3) спірт;
4) дождж;
5) торф.

**7.Адзначце *зборныя* назоўнікі:**
1) куп'ё;
2) студэнцтва;
3) клей;
4) тэрарызм;
5) дзятва.

**8.Адзначце р*эчыўныя* назоўнікі:**
1) хмызняк;
2) бетон;
3) зерне;
4) мёд;
5) порах.

**9.Адзначце *абстрактныя* назоўнікі:**
1) спектакль;
2) кампраміс;
3) лязгат;
4) крыміналістыка;
5) горад.

**10.Адзначце словазлучэнні з *правільнымі формамі* назоўнікаў:**

1) зялёныя лясы;
2) віншаваць Івановых;
3) чорныя валоссі;
4) розныя моладзі;
5) гандляваць садавінамі.

**19. Выканайце праверачную работа па тэме: "Правапіс назоўнікаў".**

***1 варыянт***

**1.Выпішыце ў адзін слупок назоўнікі, якія пішуцца разам, а ў другі – праз злучок**.

(Авія) матор, (ваен) урач, (экс) чэмпіён, (фота) атэлье, (контр) ігра, (паў) Францыі, (сацыял) рэвалюцыянер, (міні) сачыненне, (прэс) служба.

**2.Запішыце назоўнікі ў форме адзіночнага ліку роднага склону.**

Укладка асфальт…, студэнты інстытут…, камандзір батальён…, палеткі аўс…, няма суфікс…, ружовы ад мароз…, з боку лес…, не чуў стук…, луста хлеб…, на беразе канал…

**3.Запішыце назоўнікі, што ў дужках, у форме меснага склону адзіночнага ліку.**

Плыць на (лодка), на высокай (хвоя), аб маладым (дырэктар), пляма на (рука), на вялікім (луг), расказваць аб (бацька), аб маленькім (задзіра), жыць у (горад), на высокай (гара), вымакнуць на (дождж).

**4.Запішыце назоўнікі ў форме творнага склону адзіночнага ліку.**

Бандэроль, запаведзь, кроў, Сібір, гусь, косць, веліч,актыўнасць, шынель, глыб.

**5.Праскланяйце назоўнікі** птушаня, Пеця.

***2 варыянт***

**1.Выпішыце ў адзін слупок назоўнікі, якія пішуцца разам, а ў другі – праз злучок.**

(Обер) лейтэнант, (экспрэс) дастаўка, (супер) зорка, (контр) адмірал, (унтэр) афіцэр, (грос) майстар, (паў) лімона, (мікра) малекула,(двухсот) годдзе, (віцэ) консул.

**2.Запішыце назоўнікі ў форме адзіночнага ліку роднага склону.**

Страшнага здзек…, вышыня кедр…, прыхільнікі лібералізм…, папіць кефір…, злез з матацыкл…, мэбля з дуб…, не было вопыт…, прыехалі з Віцебск…, з боку луг…, не было даждж….

**3.Запішыце назоўнікі, што ў дужках, у форме меснага склону адзіночнага ліку.**

Аб маім (сябар), сляза на (шчака), купацца ў (рэчка), ехаць на (трактар), у родным (край), аб сваім (кавалер), на дзявятым (паверх), запісаць на (дошка), аб (плакса) Машы, расказаць аб (дзядуля).

**4.Запішыце назоўнікі ў форме творнага склону адзіночнага ліку.**

Медаль, ветлівасць, Об, любоў, медзь, соль, радасць, Свіцязь, боль, ціш.

**5.Праскланяйце назоўнікі** дзядзька, дзіця.